# ДА УВАГІ МАСТАКОЎ!

Упраўленнем культуры Брэсцкага аблвыканкама арганізаваны абласны конкурс работ самадзейных мастакоў **“Храмы Берасцейшчыны”.**

Конкурс праводзіцца ў двух намінацыях:

- у першай намінацыі прымаюць удзел самадзейныя мастакі, якія не маюць спецыяльнай мастацкай адукацыі,
- у другой намінацыі прымаюць удзел самадзейныя мастакі, якія маюць пачатковую мастацкую адукацыю (мастацкія школы, гімназіі, сярэднія і базавыя школы з мастацкім ухілам, гурткі, студыі ВМ і ДПМ).

Узрост удзельнікаў конкурса ў двух намінацыях – **ад 18 год на 1 красавіка 2010 года.**

Колькасць конкурсных твораў ад аднаго ўдзельніка – **не болей двух.** Работы могуць быць выкананы ў любой тэхніцы. **Памер работы – ад 0,4 х 0,6м да 1,5 х 1,5м.**

Работы павінны быць эстэтычна аформлены (у рамках). Кожная работа павінна суправаджацца адпаведнай анатацыяй (прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, горад, назва работы, год ставрэння работы, тэхніка выканання).

Да работы дадаецца электронны варыянт (CD-дыск) падрыхтаваных матэрыялаў:

- аўтабіяграфічныя звесткі ўдзельніка (прозвішча, імя, імя па бацьку, год нараджэння, месца жыхарства, кантактны тэлефон, наяўнасць мастацкай адукацыі, кароткая біяграфія);
- фотаздымак удзельніка конкурса ў фармаце JPEG;
- фотаздымкі работ удзельніка ў фармаце JPEG. Кожная работа павінна быць асобным фотаздымкам. Работы суправаджаюцца наступнымі звесткамі: назва работы, тэхніка выканання, фармат, дата стварэння работы, назва храма, адлюстраванага ў рабоце, месца знаходжання храма (населены пункт, раён).

Пераможцы першага тура будуць вызначаны ў кастрычніку-снежні 2010 года абласным журы на праглядзе гарадской выставы работ і прымуць удзел у другім туры, які адбудзецца ў красавіку 2011 года ў г.Брэсце. Пад час правядзення выніковай абласной выставы журы вызначыць пераможцаў конкурсу. У рамках адкрыцця абласной выставы адбудзецца ўзнагароджванне пераможцаў Дыпломамі I, II, III ступеней.

Будзе выдадзены буклет лепшых работ удзельнікаў конкурсу. Для пераможцаў абласнога конкурсу будзе арганізавана экскурсія па знакамітых месцах Берасцейшчыны.

Заяўкі на ўдзел у конкурсе **“Храмы Берасцейшчыны”** прымаюцца да 30 верасня 2010 года па адрасу: г.Баранавічы, вул.Горкага,20, кабінет 207, арганізацыйна-метадычны цэнтр аддзела культуры гарвыканкама. Тэлефоны для даведак: 42-38-36, 42-29-94. E-mail:o-m-c@mail.ru.